ВЫКАРЫСТАННЕ ПРЫМЕТНІКАЎ У ТЭКСТАХ РОЗНЫХ СТЫЛЯЎ

У сістэме марфалагічных рэсурсаў беларускай мовы прыметніку адводзіцца значнае месца як катэгорыі, у семантыцы якой дамінуе паняцце якасці.

Багатая і гнуткая семантыка прыметнікаў стварае разнастайныя вобразна-выяўленчыя магчымасці, якія найперш рэалізуюцца яго эстэтычнай функцыяй. У той жа час не менш важнае значэнне мае інфарматыўная функцыя прыметнікаў, якія выкарыстоўваюцца для звужэння аб'ёму паняцця, выражанага назоўнікам. Гэта і робіць прыметнік незаменным ва ўсіх стылях, калі ўзнікае неабходнасць у канкрэтызацыі значэння, выражанага прадметным словам.

Частотнасць прыметнікаў у тэкстах у значнай ступені абумоўліваецца найперш частотнасцю ўжывання назоўнікаў у мове.

Адметнай прыметай ужывання прыметнікаў у розных функцыянальных стылях з'яўляецца перавага адносных прыметнікаў у навуковым , афіцыйна-дзелавым стылях і вялікая колькасць якасна-адносных прыметнікаў у мастацкім стылі. У гэтым праяўляецца ўплыў экстралінгвістычных фактараў, якія і вызначаюць у пэўнай ступені семантыка-тэматычны адбор "якасных слоў"—прыметнікаў у тэкстах розных функцыянальных стыляў.

Так, ужыванне адносных прыметнікаў у заканадаўчых дакументах абумоўлена неабходнасцю частага выражэння ў іх адносін паміж асобамі і дзяржавай, асобамі і прадметамі і г.д.Тут часта выкарыстоўваюцца такія прыметнікі, як ***дзяржаўны, вытворчы, камерцыйны, фінансавы, гаспадарчы, грамадскі, прыватны, індывідуальны*** *і інш.*

Вялікая колькасць прыметнікаў выконваюць ролю тэрмінаў, у тым ліку і ўласных тэрміналагічных найменняў у форме ўстойлівых словазлучэнняў: ***Садружнасць Незалежных Дзяржаў, Дзяржаўная Дума, Цэнтральны выбарчы камітэт, федэральныя войскі і інш.***

У публіцыстычным стылі таксама назіраецца спецыялізацыя некаторых семантычных груп прыметнікаў, якім нясуць вялікую экспрэсіўную нагрузку ў складзе ацэначнай лексікі. Гэта прыметнікі тыпу ***распаясаны, шалёны, ашалелы, абвальны, апантаны*** і інш.

Дастаткова шырока ўжываюцца прыметнікі і ў навуковым стылі. Значнае распаўсюджанне тут атрымалі ўстойлівыя спалучэнні-тэрміны: ***удзельная вага, каленчаты вал, ротавая поласць, мяккі знак, залежны стан, закончанае трыванне, галоўны сказ, дадны сказ, лагічны націск, неазначальная форма дзеяслова, адушаўлёныя назоўнікі і інш.***

Адзначым, што ў кніжных стылях прыметнікі найперш выконваюць інфарматыўную функцыю і вызначаюцца навуковай дакладнасцю.

Асабліва яркае, выразнае стылістычная роля прыметнікаў выяўляецца ў мастацкім стылі. Прыметнік па праву называюць **самай жывапіснай часцінай мовы ў мове мастацкага тэксту**. Гэта абумоўлена найперш наступным:

1) неабходнасцю ў дэталях абмаляваць знешнасць героя;
2) псіхалагічны стан герояў, іх характар;
3) у дэталях перадаць пейзажныя замалёўкі.

Напрыклад: вось як апісвае Я.Колас дзяка Бацяноўскага ў трылогіі "На ростанях": *"Нецікава сядзець са **старым** дзяком. **Сухі і нішчымны**, як **абмалочаны** сноп. Нейкі **старэцкі** скептызм прабіваецца ў яго словах, затхласцю мінуўшчыны аддае яго размова, і сам **ён прапахлы царкоўнымі** канонамі, **выпетранымі і бяздушнымі**, **лампадным** алеем і воскам **царкоўных** свечак, здаецца нейкім **прыкрым** архаізмам, **варожым** да ўсяго, што **свежа і молада**"* (IX, с. 292) – умелае спалучэнне прыметнікаў розных разрадаў і рознай структуры: якасных і адносных, поўных і кароткіх (*што свежа і молада*) дыскрэдытуе цемрашала і даносчыка, прыніжае годнасць алтарнага служкі.

Ад'ектыўнай разнастайнасцю, багаццем адценняў вызначаецца партрэтная замалёўка Івана Мележа, апісаная Алесем Асіпенкам:

"Ах, гэтая мележаўская ўсмешка!

Прыязная, іранічная, загадкавая, сарамлівая, кплівая, цёплая, хітраватая, задумлівая, шматфарбная і шматзначная, але заўсёды чалавечная, неабразлівая.

Такой усмешкі ні ў кога не было – адразу і так многа таноў, паўтонаў, адценняў, як у той вясёлкі, што летнім днём перакідваецца цераз ціхую задуменную Прыпяць.

*Усмешка – водбліск душы. **Пустая** душа – **пустая** ўсмешка. У Мележа ўсмешка **была таленавітая, шчырая**. Яна сагравала прыязнасцю і тады, калі азмрачалася самотай...*

*Смех – разрадка. Ён адключае чалавека хоць на імгненне ад напружанай працы мозгу. Ды нават і тады, калі Мележ смяяўся ад ўсяе душы, з ягонага твару – во дзіва!—не знікала напружанасць думкі. Усмешка нібы падкрэслівала гэтую напружанасць – можа, таму і была **вінаватая, сарамлівая**? – а думка надавала ёй з**аклапочаную** сталасць".*

Пры абмалёўцы псіхалагічнага стану героя: У беларускай літаратуры склалася багатая традыцыя стылістычнага асваення прыметнікаў-эпітэтаў у розных апісаннях, і найперш у партрэтных і пейзажных .

Напрыклад: Коласаўскае апісанне запозненай восені ў трылогіі “На ростанях”: “*Адшумелі свой час* ***неспакойныя восеньскія*** *вятры.* ***Нізкія, разарваныя*** *ветрам* ***мітуслівыя*** *хмары выплакалі* ***халодныя*** *слёзы.*

Кароткія, змрочныя *дні наводзілі паныласць і смутак, прыгняталі добры настрой і адчуванне. Быў той час, калі людзі прасілі: “Прыходзіла б зіма... І вось у адзін дзень* ***бязладныя, неспакойныя*** *хмары, нібы* ***спалоханыя птушкі****, падняліся вышэй, зрабіліся болей* ***тугімі****. Падзьмула з поўначы* ***здаровым*** *халадком. Зямля сушэла, пакрывалася* ***цвёрдаю*** *скарынкаю. А пад поўнач пасыпаў сняжок,* ***заложны, спорны, густы і сухі****. Снег ішоў усю ноч і ўвесь заўтрашні дзень. Пад вечар снег снег суняўся. На захадзе бліснула* ***журботная, ласкавая*** *ўсмешка сонца і патухла”* (IX, 567—568).

Стылістычнае значэнне прыметнікаў у сістэме моўна-выяўленчых сродкаў марфалогіі ставіць яго ў асобае становішча ў параўнанні з іншымі часцінамі мовы. Без прыметнікаў мова мастацкіх твораў “сумная, вялая, збедненая, бляклая”.